ванное место для прохождения организационно-экономической, производственной аналитической и преддипломной практики; представление бухгалтерских и статистических данных для аналитических разделов научных работ; возможность внедрения результатов исследования в практическую деятельность инспекции;

– для выпускников: гарантированное рабочее место сразу после окончания университета без опыта работы;

– для кафедры: студенты, заинтересованные в изучении профильных дисциплин; наличие мест распределения после окончания обучения; повышение престижа специальности; подтверждение востребованности выпускников на рынке труда;

– для ИМНС: подготовка высококвалифицированных кадров, мотивированных и заинтересованных специалистов;

– для региона: повышение привлекательности регионального ВУЗа, повышение качества подготовки кадров для налоговой инспекции, повышение уровня взаимодействия университета и организации практической сферы.

Таким образом, целевая подготовка, обладая рядом существенных преимуществ для всех участников, повышает уровень теоретической и практической подготовки специалистов для национальной экономики, способствуя росту ее эффективности и конкурентоспособности, а также гармоничному развитию человеческого потенциала, что чрезвычайно актуально в 2024 году, объявленном Годом качества в Республике Беларусь.

**Литература**


1. Министерство по налогам и сборам : официальный сайт // Режим доступа : https://nalog.gov.by. – Дата доступа : 30.01.2024.
2. Положение о целевой подготовке специалистов, рабочих, служащих : Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 31.08.2022 № 572 // Режим доступа : https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22200572&p1=1. – Дата доступа : 30.01.2024.



***УДК 37.091.33:821.161.3***


***А. В. Брадзіхіна***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*


## СПОСАБЫ АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ НА АРЫЕНТАЦЫЙНЫМ ЭТАПЕ ВЫВУЧЭННЯ МАСТАЦКАГА ТВОРА

Адной з важнейшых дысцыплін у падрыхтоўцы будучага настаўніка-славесніка з’яўляецца методыка выкладання беларускай літаратуры, арганізацыя ўніверсітэцкіх заняткаў на якой, згодна з яе прыкладной спецыфікай, вымагае практыка-арыентаванага падыходу. Так, мадэляванне ўрыўкаў школьных урокаў, калі студэнт выступае ў ролі настаўніка, а група імітуе навучальную дзейнасць вучняў, уяўляецца даволі плённым. Засвоіўшы тэарэтычны матэрыял, большасць студэнтаў-філолагаў здольная на практычных занятках скласці сістэму заданняў па вывучэнні мастацкага твора школьнікамі, распрацаваць неабходныя вучэбныя сітуацыі на кожным этапе яго вывучэння (уступным, арыентацыйным, этапе аналізу і заключным) з улікам патрабавання іх чаргавання і разнастайнасці.

Разам з тым нярэдка ў будучых настаўнікаў выклікае праблемы якасная рэалізацыя прыёмаў і форм актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці класа, якія або становяцца самамэтай, і ў выніку забаўляльная функцыя выходзіць на першы план, або застаюцца беспаспяховымі з-за падбору студэнтамі няўдалых спосабаў зацікавіць вучняў складаным ці далёкім ад іх літаратурным матэрыялам. Пры гэтым значна прасцей арганізаваць такую дзейнасць на тых этапах вывучэння мастацкага твора, у якія іманентна закладзены эўрыстычны пачатак (аналіз, заключны) або першапачаткова задзейнічана эмацыйная сфера (уступны этап).

Арыентацыйны (арыенціровачны) этап з’яўляецца неабходным звяном у асэнсаванні школьнікамі мастацкага тэксту, хаця некаторыя сучасныя метадысты адмаўляюць яму ў самастойнасці [1]. Ён мае тры асноўныя мэты – выявіць сілу эмацыянальнай рэакцыі, высветліць якасць засваення зместу твора і падрыхтаваць вучняў да аналізу, якія прадугледжваюць пераважна рэпрадуктыўныя віды дзейнасці. Паспрабуем акрэсліць асноўныя кірункі па арганізацыі будучымі настаўнікамі-славеснікамі эфектыўных прыёмаў і форм работы па актывізацыі пазнаваўчага патэнцыялу вучняў на гэтым этапе.

Першая з агучаных вышэй мэт арыенціровачнага этапу, дзякуючы падключэнню эмацыйнага фактару, эфектыўна рэалізуецца нават у межах традыцыйных адукацыйных тэхналогій. Найбольш распаўсюджаным прыёмам для высвятлення першаснага ўражання вучняў ад прачытанага твора з’яўляецца рэпрадуктыўная гутарка ацэначнага характару, узмоцненая так званай “хвілінай маўчання” (паўзай у некалькі секунд), абавязковай у выпадку вывучэння твораў лірычнага роду. Для падтрымання цікавасці да тэмы ўрока важна захаваць шчырасць рэакцый школьнікаў на тэкст, таму ў выпадку агульнага пытання, ці спадабаўся твор, настаўніку варта быць гатовым і да адмоўных адказаў і ў такім разе папрасіць вучняў аргументаваць сваю ацэнку. Яшчэ лепш канкрэтызаваць пытанне: што больш за ўсё ўразіла (запомнілася, спадабалася, не спадабалася і г. д.) у творы. Падобныя заданні могуць быць прапанаваны і ў пісьмовай форме, асабліва калі першаснае чытанне тэксту было зададзена ў якасці дамашняга задання. Гэта можа быць мінісачыненне, эсэ ці водгук, але тэму яго трэба сфарміраваць такім чынам, каб вучань мог выявіць дасведчанасць у змесце і выказаць сваю індывідуальную пазіцыю. Калі пісьмовае заданне прапанавана на дом, то важна, каб настаўнік не абмяжоўваў фантазію дзяцей, іншымі словамі, яно павінна прадугледжваць вольную форму выкладу. Калі напісанне ацэначнанага водгуку ці эсэ праводзіцца ў класе, на яго адводзіцца не больш за 5–7 хвілін, і затым яно суправаджаецца франтальным абмеркаваннем.

Другая мэта арыенціровачнага этапу – высвятленне якасці засваення зместу твора – патрабуе заданняў рэпрадуктыўнага характару. Акрамя традыцыйнай гутаркі, гэта могуць быць крыжаванкі, віктарыны, гульня “Пазнай героя па…” (фразе, прадмету, дэталі адзення і інш.), праца з планам ці сціслым пераказам твора, індывідуальныя заданні на картках, наглядны метад і інш. З сучасных метадаў і прыёмаў з мэтай узнаўлення зместу прачытанага твора мэтазгодна выкарыстоўваць воблака тэгаў, філворды, інтэрнэтгульні, прапанаваныя вучням праз спасылкі або QR-коды. Спынімся на некаторых прыёмах падрабязней.

Арганізуючы віктарыну на ўроку літаратуры, варта памятаць яе адрозненні ад звычайнай гутаркі, якія палягаюць найперш у колькасці пытанняў. Віктарына, будучы гульнёвым відам дзейнасці, павінна мець іх як мінімум некалькі дзясяткаў, каб вызначыць пераможцу, што з’яўляецца другой неабходнай адметнасцю гэтага прыёму, адлюстраванай ужо ў этымалогіі яго назвы. Па-трэцяе, віктарына патрабуе матэрыяльных пацверджанняў правільнасці адказу – фантаў, якія ўручаюцца вучню ў выпадку карэктнага рашэння і якія ў далейшым дапамогуць аб’ектыўна падвесці яе вынікі (у выпадку каманднай віктарыны яны могуць быць заменены на нематэрыяльныя пазнакі, скажам, смайлы ці зорачкі, якія малююцца настаўнікам на дошцы). Вызначэнне апошніх, падкрэслім, павінна мець матывацыйны характар, улічваць поспех кожнага вучня, няхай сабе гэта будзе ўсяго адзін правільны адказ. Менавіта таму падлік неабходна пачынаць з выяўлення вучняў з адным фантам і падтрымаць іх пэўным добразычлівым жэстам, да прыкладу, апладысментамі. Адрозненні паміж гутаркай і віктарынай заключаюцца і ў тым, што апошняя ўлічвае і хуткасць рэакцый вучняў, а таксама ў якасці саміх пытанняў. Калі рэпрадуктыўная гутарка на арыенціровачным этапе прадугледжвае высвятленне асноўных вобразаў, сюжэтных вузлоў ці прычынна-выніковых сувязяў, то віктарына засяроджваецца на дэталях і нюансах, якія немагчыма заўважыць у выніку павярхоўнага прачытання тэксту. Параўнаем складанасць і форму пытанняў пры арганізацыі гэтых

прыёмаў на прыкладзе апавядання “У старых дубах” Я. Коласа (5 клас). Рэпрадуктыўная гутарка: “Назавіце імёны галоўных герояў твора”, “На чым грунтуецца іх сяброўства?”, “Якую працу хлопчыкі выконваюць трэцяе лета разам?” і г. д. Віктарына: “Якім прыметнікам надзяляе аўтар дубы ў самым пачатку твора?”, “Як гатавалі сала хлопчыкі?”, “Каго заўважыў Грышка на супрацьлеглым беразе ракі перад тым, як напужаць Базыля?” і г. д. Галоўнае патрабаванне, якое аб’яднае абодва прыёмы на гэтым этапе – пытанні павінны ахопліваць увесь тэкст.

Працу з планам на арыенціровачным этапе мэтазгодна ажыццяўляць пад час вывучэння твораў з незвычайнай кампазіцыйнай будовай. Гэта не толькі складанне плана ў адпаведнасці з абраным відам (план-тэзісы, план-загалоўкі, план-пытанні ці цытатны план), але і выбар найбольш дакладнага яго варыянта з прапанаваных. Да прыкладу, да згаданага вышэй апавядання могуць быць падрыхтаваны наступныя карткі:

*Варыянт 1*
1. Цішыня ў старых дубах.
2. Дуб над Нёманам.
3. Неразгаданыя таямніцы ракі.
4. Спакой і веліч прыроды.

*Варыянт 2*
1. Старасвецкія дубы.
2. Забавы хлопчыкаў.
3. Думкі Базыля пра таямніцы прыроды.
4. Дзіцячае свавольства і яго наступствы.

*Варыянт 3*
1. Базыль і Грышка – найлепшыя дружбакі.
2. Думкі Базыля.
3.Трагічны выпадак.
4. Выратаванне.

Яшчэ адным заданнем можа стаць аднаўленне трансфармаванага плана, ці ўзнаўленне парадку эпізодаў твора, прадстаўленых як тэкставымі цытатамі, так і малюнкамі да твора, а таксама выпраўленне фактаграфічных памылак у тэксце (разнавіднасць прыёму “какаграфіі”), што можа ажыццяўляцца як на слых, так і прадстаўляцца на картках: “У паветры было ціха, толькі звон медных бомаў зліваўся ў адну доўгую-доўгую аднатонную песню, і, здавалася, прырода была закалыхана гэтым крыху сумным звонам. Маленькія мушкітаўкунчыкі кучкамі гулялі на сонцы, як бы чыясьці нявідная рука трэсла ў паветры маленькую сетачку”. Памылковыя ў дадзеным выпадку вобразы медных бомаў і мушак.

Карыснымі ў павышэнні матывацыі і цікавасці школьнікаў да тэмы ўрока будуць заданні з выкарыстаннем ІКТ. Пры вывучэнні твораў з вялікай колькасцю герояў, напрыклад, “Жураўліны крык” В. Быкава або “Насцечка” К. Чорнага, можна прапанаваць дзецям гульню “Пазнай імёны герояў твора”. Прычым можна карыстацца як гатовымі варыянтамі такіх гульняў [2], так і стварыць іх самастойна з дапамогай аднаго з анлайн-канструктараў вучэбных трэнажораў, да прыкладу, https://etreniki.ru або https://onlinetestpad.com/by. З гэтай жа мэтай можна звярнуцца да філвордаў, якія таксама дазваляюць праверыць рэпрадуктыўныя веды, у тым ліку правільнасць успрыняцця зместу твора [3].

На заключэнне заўважым, што эфектыўнасць прыёмаў і форм актывізацыі пазнавальнай актыўнасці вучняў у многім залежыць ад разнастайнасці і навізны, а таксама ад педагагічнай пазіцыі настаўніка, якая павінна прадугледжваць павагу да вучня і свабоду яго выбару замест прымусу.

**Літаратура**

1. Руцкая, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры / А. В. Руцкая, М. У. Грынько. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2010. – 184 с.

2. Онлайн-конструктор учебных тренажёров. – Режим доступа: https://etreniki.ru/VL48W51YZ7. – Дата доступа: 26.01.2023.

3. Філворды анлайн. – Режим доступа: https://onlinetestpad.com/by/crosswords/fillword. – Дата доступа: 26.01.2023